# СПЫТАЙЦЕ ПРЭЗІДЭНТА

Сёння, 10 красавіка, кіраўнік дзяржавы праводзіць сустрэчу з журналістамі на тэлестудыі Белтэлерадыёкампаніі. Пытанні яму падрыхтавалі не толькі журналісты, але і карыстальнікі інтэрнэту. Учора ў акаўнтах Белтэлерадыёкампаніі ў сацыяльных сетках з'явілася прапанова ўсім ахвотным падключыцца да дыялогу з лідарам нашай дзяржавы і даслаць на паштовую скрыню voprosnomer1@tvr.by сваё пытанне. Самыя арыгінальныя будуць перададзены Аляксандру Лукашэнку пры новым фармаце яго зносін з прадстаўнікамі чацвёртай улады, паабяцалі аўтары паведамлення.

Выдавецкі дом «Звязда» таксама бярэ ўдзел у гутарцы з Прэзідэнтам.


Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КРАСАВІКА 2018 г. АЎТОРАК № 68 (28684)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# СВЯТОЧНАЯ НЯДЗЕЛЯ



Фота БЕЛТА.

**На Вялікдзень Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з мітрапалітам Філарэтам, пачэсным Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі. Кіраўнік дзяржавы наведаў дамавы храм Мінскага епархіяльнага ўпраўлення ў гонар Сабора Беларускіх святых. Аляксандр Лукашэнка разам з сынам Мікалаем і мітрапалітам запалілі свечку і абмяняліся падарункамі.**

«Сёння я вырашыў прыехаць да вас у дамавы храм, які вельмі люблю, — адзначыў Прэзідэнт. — Хачу ад сябе асабіста і ад вас павіншаваць беларускі народ са светлым святам Вялікадня. Гэта самае жаданае свята ў нашага народа, вы гэта добра ведаеце. Таму дазвольце мне вас павіншаваць з гэтым светлым святам і ўвесь беларускі народ, пажадаць дабра і шчасця».

Аляксандр Лукашэнка падарыў мітрапаліту Філарэту велікодныя кошык і яйка, выкананае ў тэхніцы сожскай сканi. Мітрапаліт у адказ — велікоднае яйка мастацкай работы з выявай абраза «Уваскрэсенне Хрыстова».

Таксама Прэзідэнт Беларусі павіншаваў са святам Вялікадня Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. «Уваскрэсенне Хрыстова напаўняе сэрцы людзей цяплом і любоўю, дорыць кожнаму светлыя надзеі і веру ў лепшае. Гэты вялікі дзень з'яўляецца сімвалам перамогі дабра над злом і трыумфу жыцця, умацоўвае імкненне чалавека прыносіць карысць навакольным», — гаворыцца ў віншаванні.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# Жодзінскі «Каваль»



У самым цэнтры горада беларускіх машынабудаўнікоў — Жодзіна, а менавіта на праспекце Міра, сярод вулічных арт-аб'ектаў устаноўлены і гэты — постаць жалезнага каваля. Фігуру праектавалі, канструявалі, збіралі і зварвалі на заводзе цяжкіх штамповак. Цяпер «Каваль» — любімая пляцоўка адпачынку многіх жодзінцаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Савет Міністраў на мінулым тыдні вызначыўся з тым, каго і як будуць адносіць да грамадзян, што не занятыя ў эканоміцы, якія будуць плаціць па поўным кошце. Спецыяльна для работы на месцах ва ўсіх раёнах будуць створаны спецыяльныя камісіі з дэпутатаў, чыноўнікаў і грамадскіх дзеячаў. Прэзідэнт запісаў у гэтым дэкрэце, што камісіі (раённыя, гарадскія, абласныя), як правіла, узначальваюцца старшынямі адпаведных Саветаў. Галоўнае ў рабоце падобных камісій — індывідуальны падыход да кожнага. Трэба ўбачыць чалавека. А магчыма гэта праз дэпутатаў, якія працуюць побач».*

■ Тэма

# ІНСТРУКЦЫЯ ЎЛАСНАЙ БЯСПЕКІ

Як аказалася, не кожны крэдытаатрымальнік адэкватна ацэньвае свае фінансавыя магчымасці...

**Нацыянальны банк зацвердзіў новую інструкцыю аб выдачы крэдытаў. Тэкст дакумента апублікаваны на Нацыянальным прававым партале. Банкі будуць разлічваць для фізічных асоб каэфіцыент пазыковай нагрузкі. Акрамя таго, распрацавана спецыяльная форма, якую фінансавая ўстанова павінна запоўніць і паказаць крэдытаатрымальніку да таго, як ён падпіша дагавор. Падрабязна пра гэта паведаміла падчас брыфінгу ў прэс-цэнтры БЕЛТА намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання банкаўскіх аперацый Нацыянальнага банка Вольга ІЛЮКЕВІЧ.**

## ДАГАВОР БЕЗ ДРОБНАГА ШРЫФТУ

Нацбанк пастановай праўлення ад 29 сакавіка зацвердзіў інструкцыю аб парадку выдзялення грашовых сродкаў у форме крэдыту і іх вяртання (пагашэння). Дакумент абагульняе на практыцы нормы, якія ўжо ўжываюцца, а таксама змяшчае шэраг новаўвядзенняў. У прыватнасці, уводзяцца новыя тэрміны: «грэйс-перыяд», «адтэрміноўка плацяжу па крэдытным дагаворы» і «растэрміноўка плацяжу па крэдытным дагаворы», «тэрмін поўнага вяртання (пагашэння) крэдыту», «мультывалютны крэдыт» і «мультывалютная крэдытная лінія».

«Адной з ключавых змен у сферы рознічнага крэдытавання, накіраванай на забеспячэнне абароны правоў спажыўцоў банкаўскіх паслуг, з'яўляецца ўвядзенне ўніфікаванай для ўсіх банкаў формы інфармацыі аб умовах крэдытавання, якую банк абавязаны даць кліенту да заключэння крэдытнага дагавора. Важна адзначыць, што банк абавязаны праінфармаваць кліента аб бясплатным спосабе вяртання крэдыту, а таксама аб наяўнасці паслуг, што аказваюцца банкам або трэцімі асобамі за асобную плату і якія з'яўляюцца абавязковымі для заключэння крэдытнага дагавора», — падкрэсліла Вольга Ілюкевіч. Гаворка, напрыклад, можа ісці аб страхавых паслугах.

СТАР. 2

# Карысна, танна, актуальна: моладзь прапануе ідэі

Больш за сотню ідэй ад маладых беларускіх навукоўцаў і вынаходнікаў дайшло да фіналу. Самы адказны этап — абарона распрацовак перад рэспубліканскім экспертным саветам — адбудзецца ў Мінску, дзе пачнецца фінал конкурсу «100 ідэй для Беларусі»

**Урачыстае адкрыццё свята навукі і інавацый, якое натхняе моладзь, будзе праходзіць два дні. У 16 намінацыях прадставяць 119 аўтарскіх распрацовак прэтэндэнты з усёй Беларусі. Свае наватарскія прапановы пакажуць і дзесяць аўтараў найлепшых праектаў ад Гомельшчыны.**



**Дзмітрый ЗАХАРАНКА з Мазыра ажыццяўляе праект «Вырошчванне сеянцаў дуба чарэшчатага з закрытай каранёвай сістэмай».**

## ІМІТАЦЫЯ — НА АХОВЕ ЗДАРОЎЯ

Сярод найлепшых ідэй Гомельшчыны — ашыйнік для пошуку хатніх жывёл «SearchPets» Аляксея Кляменцава, праект «Help Me» Максіма Кір'янава, сацыяльны праект «Вывучаем садружнасць разам» Вольгі Музычэнкі і Кацярыны Паповай, «Нам завешчана памяць берагчы» Анастасіі Тарасавец... Ад Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта і абласной арганізацыі БРСМ маладыя інаватары атрымалі сертыфікаты фіналістаў і каштоўныя падарункі. Спецыяльны прыз ад рэгіянальнага прадстаўніцтва бізнес-школы ІПМ у Гомелі — сертыфікат на навучанне атрымаў выкладчык кафедры ваеннай і экстрэмальнай медыцыны Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Алег Дохаў. Ён распрацаваў трэнажор унутрывенных ін'екцый і забору крыві.

— Мой праект адносіцца да галіны сімуляцыйнага навучання ў медыцыне. Унікальнасць распрацоўкі ў тым, што мы выкарыстоўваем такія матэрыялы, якія дакладна і рэалістычна імітуюць чалавечыя тканкі: скурнае покрыва, вянозную сценку і кроў. Рэалістычнасць такая, што многія студэнты, асабліва першых курсаў універсітэта, спачатку нават палохаюцца. Пры падборы матэрыялаў мы вывучылі асноўныя іх характарыстыкі: візуальныя, тактыльныя, эластычнасць і іншыя параметры тканак чалавека. Трэнажор просты ў эксплуатацыі і вытрымлівае да 350—500 праколаў. Той варыянт, які мы маем зараз, каштуе 65 рублёў. Гэта значна танней, чым аналагі, якія прапануюць замежныя кампаніі.

СТАР. 5

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПАЎНОЧНАЯ КАРЭЯ ЗАЯВІЛА ПРА ГАТОЎНАСЦЬ АДМОВІЦЦА АД ЯДЗЕРНАЙ ЗБРОІ

КНДР паведаміла ЗША, што гатовая да абмеркавання пытання дэнуклеарызацыі Карэйскага паўвострава. Пра гэта са спасылкай на амерыканскія крыніцы паведаміла Reuters. Праблему дэнуклеарызацыі лідар КНДР Кім Чэн Ын гатовы абмеркаваць падчас сустрэчы з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам. Як паведамлялася, Вашынгтон і Пхеньян праводзяць сакрэтныя перагаворы аб падрыхтоўцы сустрэчы паміж кіраўнікамі дзвюх дзяржаў. Перагаворы курыруе былы дырэктар ЦРУ, вылучаны на пасаду дзяржсакратара ЗША Майк Пампеа. Паведамляецца, што прадстаўнікі разведслужбаў ужо сустракаліся ў трэцяй краіне.

## ПАРТЫЯ ВІКТАРА ОРБАНА ЗНОЎ АТРЫМАЛА КАНСТЫТУЦЫЙНУЮ БОЛЬШАСЦЬ У ПАРЛАМЕНЦЕ

Прэм'ер-міністр Венгрыі і старшыня партыі «Венгерскі грамадзянскі саюз» Віктар Орбан абвясціў пра перамогу цяперашняй кіруючай кааліцыі на парламенцкіх выбарах, якія адбыліся ў нядзелю. Палітычны блок партыі Орбана і Хрысціянска-дэмакратычнай народнай партыі атрымалі канстытуцыйную большасць (гэта дзве трэці дэпутацкіх мандатаў). «Пры такіх выніках нельга не ўспомніць старую прымаўку: трэба быць сціплейшым, таму што ў вас для гэтага ёсць вельмі важная падстава», — пажартаваў Віктар Орбан. Другое месца атрымаў рух «За лепшую Венгрыю» — 20 % галасоў, што дае ім 26 дэпутацкіх крэслаў. Трэцімі фінішавалі сацыялісты. Нагадаем, што прэм'ер-міністр Венгрыі на працягу доўгага часу выступае супраць прыняцця бежанцаў з Блізкага Усходу, нягледзячы на абурэнне Еўрасаюза. Менавіта гэтая тэма стала адной з цэнтральных падчас выбарчай кампаніі.

ISSN 1990 - 763X

18068>

9 771990 763008

## У БЕРЛІНЕ ПРАДУХІЛЕНЫ ТЭРАКТ

Як паведамілі праваахоўныя органы ФРГ, былі затрыманы шэсць чалавек, якія планавалі ажыццявіць напад у нядзелю падчас Берлінскага паўмарафону. Усе затрыманыя — маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 21 года. Пры гэтым адзін з іх быў блізкім знаёмым Аніса Амры, тунісца, які здзейсніў тэракт на калядным рынку ў Берліне два гады таму. Афіцыйна не паведамляецца, якія менавіта былі планы ў затрыманых. Аднак шэраг нямецкіх СМІ са спасылкай на крыніцы, блізкія да следства, паведамілі, што падазраваныя збіраліся напасці на лёгкаатлетаў і гледачоў з нажамі.

## РАКФЕЛЕРЫ І СОРАС УЗНЯЛІ БІТКОЙН



Асноўныя крыптавалюты на таргах адзначыліся ростам пасля паведамленняў пра цікавасць да такіх актываў традыцыйных інвестараў Уол-Стрыт. Пра гэта піша Business Insider. Так, біткойн даражэў на 2,1 працэнта — больш чым 7 тысяч долараў, Ethereum паднімаўся вышэй 400 долараў, дадаўшы ў цане 3,6 працэнта. Да росту рынак перайшоў на фоне паведамленняў пра цікавасць фонду Джорджа Сораса і заснаванай Ракфелерамі кампаніі Venrock. Апошняя абвясціла аб партнёрстве з венчурнай кампаніяй CoinFund, якая займаецца інвестыцыямі ў крыптаіндустрыю. У гэты ж дзень Bloomberg паведаміў, што Soros Fund Management мае намер заняцца крыптавалютным трэйдынгам. Як вядома, з пачатку года крыптавалюты перажываюць падзенне. Так, біткойн у лютым патаннеў да 5,9 тысячы долараў, апусціўшыся да гэтай адзнакі са снежаньскіх максімумаў амаль у $20 тысяч. Ethereum у сярэдзіне студзеня дасягаў рэкорднага кошту 1,3 тысячы долараў, да сярэдзіны лютага ён знізіўся да 800 долараў і працягнуў падзенне.

## КОРАТКА

**ААТ «Мазырсоль» атрымала сертыфікат на права маркіроўкі солі харчовым знакам «Халяль».**

«Татальную дыктоўку» 14 красавіка ў Мінску напісаць можна будзе ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, Навуковай бібліятэцы БНТУ, Расійскім цэнтры навукі і культуры, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Акрамя сталіцы, пляцоўкі адкрыюцца ва ўсіх абласных гарадах Беларусі, а таксама ў Бабруйску, Мазыры, Полацку і Рэчыцы. Пачатак акцыі ў 14.00, неабходная папярэдняя рэгістрацыя.

**Міжнародны гросмайстар Барыс Гельфанд, выхаванец мінскай школы шахмат, 14 красавіка правядзе сеанс адначасовай гульні з юнымі прызёрамі рэспубліканскіх першынстваў краіны па шахматах. Матч адбудзецца ў Нацыянальным мастацкім музеі, пачатак у 11.30.**

Сусветны банк у 2018—2022 гадах накіруе на фінансаванне праектаў у Беларусі каля $570 млн.

■ Сітуацыя

# Лясы пад прыцэлам камер

**Цёплыя дні проста вабяць адпачыць у лесе. Але пікнікі на прыродзе і чалавечая ахайнасць не заўжды ідуць поруч. Адзін кінуў непатушаную цыгарэту, другі пакінуў пустую бутэльку, якая на сонцы спрацавала як збіральная лінза, — і вось сярод дрэваў закурыўся дымок...**



— За апошняе дзесяцігоддзе ўстаноўлены тры гістарычныя мінімумы з 1959 года па плошчы, пройдзенай ляснымі пажарамі, — паведаміў **першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК.** — Напрыклад, летась агонь «гуляў» па 72 гектарах лесу, а ў 2013 годзе — і ўвогуле па 50 га. Якое будзе лета — засушлівае ці не вельмі, — мы пакуль не ведаем. Але ў любым выпадку, да пажаранебяспечнага сезона мы рыхтуемся.

Лясныя гаспадаркі краіны набылі каля сотні мотапомпаў, больш за тысячу ранцавых апырсквальнікаў і іншых тэхнічных прылад. Год таму парк гаспадарак папоўнілі 75 пажарных аўтамабіляў, перададзеных Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. Яшчэ раней Міністэрства абароны перадало два дзясяткі магутных гусенічных балотаходаў. Гэтае пытанне ўзнікла пасля таго, як у 2015 годзе давадзілася тушыць лясныя пажары на Палессі, а менавіта ў багатых на балоты Столінскім і Лельчыцкім раёнах. Зараз жа балотаходы размеркаваны па ўсіх шасці абласцях. Выдаў пазыку і Сусветны банк. Гэтыя грошы пайшлі на набыццё 49 новых пажарных аўтамабіляў.

СТАР. 5

■ Тры пытанні да ўлады

# «Поспех — у камандным падыходзе»



**На пытанні нашага карэспандэнта адказвае намеснік старшыні Лёзненскага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Ірына ДЗЕРВАЕД.**

***— У Лёзненскім раёне нядрэнна выконваецца Дэкрэт Прэзідэнта № 18, накіраваны на абарону дзяцей. Калі ласка, раскажыце падрабязней пра гэта.***

— У нашым раёне працэнт кампенсацыі сродкаў абавязанымі асобамі на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, — 56,5 %. Нагадаю, што грошы пералічваюць, калі хлопчыкі і дзяўчаткі знаходзяцца ў прытулку, інтэрнаце або прыёмнай, апякунскай сям'і. Летась кампенсавалі больш за 56 тысяч рублёў.

Лічу, што каардынацыйны савет па выкананні дэкрэта працуе эфектыўна, поспех — у камандным падыходзе. На пасяджэнні каардынацыйных саветаў выканкамаў па выкананні Дэкрэта Прэзідэнта № 18, акрамя службовых асоб, запрашаюць прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, святароў. Яны, а таксама кіраўнік РАУС, прадстаўнікі пракуратуры расказваюць «праблемным» грамадзянам пра іх «перспектывы» з пункту гледжання закону. Сярод членаў камісіі і нарколаг, прадстаўнік цэнтра занятасці. Апошні можа прапанаваць працоўнае месца з улікам спецыяльнасці, якой чалавек валодае. Ёсць магчымасць бясплатна атрымаць новую.

***— Дарэчы, пра працаўладкаванне ў цэлым. Што на сёння ўяўляе сабой прамысловасць у раёне, ці адкрываюцца новыя вытворчасці?***

— На тэрыторыі Лёзненшчыны ажыццяўляюць сваю дзейнасць два прамысловыя прадпрыемствы дзяржаўнага сектара: УП ЖКГ Лёзненскага раёна, ААТ «Лёзненскі льнозавод» і шэсць — недзяржаўных.

Адкрываюцца новыя вытворчасці. Напрыклад, некалькі гадоў таму запрацаваў цэх, дзе робяць камплектуючыя па заказе вядомай абутковай фірмы «Марка».

Летась запрацаваў цэх па вырабе ніжняй бялізны і адзення вядомага беларускага брэнда Mark Formelle. 60 чалавек прайшлі навучанне, атрымалі працоўныя месцы з вельмі добрай зарплатай. У адным будынку з цэхам — крама гатовай прадукцыі, дзе заўсёды шмат пакупнікоў.

Аб'ём гадавога экспарту прадукцыі, выраблена́й прадпрыемствамі раёна, — больш за 2 мільёны долараў ЗША. Экспартныя пастаўкі вядуцца ў 13 краін свету.

***— Ірына Апалінараўна, у «Звяздзе» быў надрукаваны рэпартаж з цікавага шоу «Адзін у адзін па-лёзненску». Якія яшчэ культурныя праекты, акцыі праводзяцца ў раёне? Ці ёсць, як сёння модна казаць, турыстычная «фішка»?***

— На Лёзненшчыне часта бываў сусветна вядомы мастак Марк Шагал. Тут жылі яго сваякі. У нашым краі ім было напісана нямала работ, якія знаходзяцца ў найбуйнейшых карцінных галерэях і музеях свету. На будынку раённага Дома культуры замацавана мемарыяльная дошка ў памяць аб вялікім земляку. Ёсць у райцэнтры і бюст Шагала.

Населены пункт Зазыбы, які доўгі час уваходзіў у склад Лёзненскага раёна (цяпер — Віцебскі раён), — радзіма народнага пісьменніка БССР, акадэміка АН БССР Міхася Лынькова. Яго імя з годнасцю носіць Крынкаўская сярэдняя школа—сад, дзе адкрыты музей пісьменніка...

Наконт «фішкі» для турыстаў, лічу сярод іншага гэта і творчы брэнд «Сунічка». Яго «карані» ў абласным фестывалі самадзейных паэтаў і песеннікаў «Песні сунічных бароў».

Гэты фестываль многія гады насіў статус раённага і праводзіўся ў аграгарадку Дабрамыслі на базе Дома культуры. Цяпер і ў Лёзне. Удзел у ім бяруць паэты, музыканты, рамеснікі, іншыя людзі, надзеленыя дарам, талентам, — яркія і незвычайныя, з асаблівым пачуццём густу.

З мэтай падтрымкі таленавітых асоб у 2014 годзе ў раёне быў зацверджаны творчы брэнд «Сунічка». Усе ўстановы культуры актыўна ўключыліся ў яго распрацоўку і прасоўванне. За кароткі прамежак часу ў раённым Доме рамёстваў з'явілася разнастайная фірменная сувенірная прадукцыя. Адноўлены ручнікі пачатку XX стагоддзя, якія належаць майстрыхам нашага раёна. У іх арнаменце прысутнічае малюнак суніцы.

**Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Віншуем!

# ВЯСНОВЫЯ КВЕТКІ ДЛЯ «ЗНАМЁНКИ»

## Беларуская маладзёжная газета сёлета святкуе 80-ы дзень нараджэння

У 1938 годзе чытачы атрымалі першы нумар газеты «Знамя юности». Праходзіў час, змяняліся журналісты і рэдактары, а газета па-ранейшаму рыхтавала матэрыялы для самай дзейснай і патрабавальнай аўдыторыі — моладзі. У часы БССР тыраж выдання дасягаў мільёна асобнікаў.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір ЖАЎНЯК** падчас святочнага мерапрыемства зачытаў прывітане Прэзідэнта, дзе падкрэслівалася важнасць работы маладзёжнай рэдакцыі:

— Сёння газету цэняць за прафесійны падыход, аб'ектыўнасць і ўважлівасць у адносінах да чытачоў. «Знамя юности» стала школай майстэрства для многіх беларускіх журналістаў. Яе таленавітыя аўтары ярка і натхнёна расказваюць пра самае важнае і цікавае людзям нашай краіны. У выніку штодзённай упартай працы ўдалося стварыць паважанае і аўтарытэтнае выданне, якое прасоўвае ідэі дабрыні і патрыятызму, дапамагае выхоўваць духоўна багатую і фізічна здаровую моладзь. Упэўнены, што гэтыя пастулаты захаваюцца ў аснове рэдакцыйнай палітыкі на доўгія гады.



Фота БЕЛТА.

**Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ віншуе з юбілеем газеты галоўнага рэдактара «Знамя юности» Мікалая МАЧЭКІНА.**




У прывітальным слове нездарма згадвалася школа майстэрства. **Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў, што газета сапраўды ў многім фарміравала будучых студэнтаў факультэта журналістыкі БДУ. Маладыя людзі прыходзілі ў рэдакцыю адразу пасля школы з першымі карэспандэнцыямі і нататкамі, такім чынам знаёмячыся з прафесіяй і набіраючыся вопыту.

Для чалавека 80 гадоў — ужо сталы ўзрост. З друкаванымі выданнямі ўсё інакш. Прачула і з цеплынёй успомніў часы сваёй працы на пасадзе галоўнага рэдактара Леанід Екель, чалавек, які і сёння называе газету ласкава «Знамёначкай».

— Я не скажу, што выданне было дасканалым — у дасканаласці, звычайна, мала чалавечнага. Але гэта быў жывы і дзейсны арганізм рэдакцыі са спрэчкамі і прымірэннямі, удалымі тэмамі і «прапясочваннямі» ад рэдактара. Аднак кожны працаваў з усведамленнем, што так як мы, не зробіць справу ніхто. У «Знамёначкі» існавала асаблівая грамадзянская мужнасць. Карэспандэнт пісаў матэрыял нават усведамляючы, што з-за яго можна атрымаць непрыемнасцяў, бо не мог паступіцца сумленнем. Дарэчы, быў і ў мяне горкі вопыт, з якога я ўсвядоміў, кім павінен быць галоўны рэдактар для свайго калектыву — чалавекам, гатовым бараніць свайго журналіста ад нападкаў, асабліва, калі матэрыял на сапраўды вострую тэму.

Сённяшні **галоўны рэдактар «Знамени юности» Мікалай МАЧЭКІН** такі ж малады, як і ўвесь калектыў. Па яго словах, цяпер у газеце працуе 12 чалавек, але кожнага супрацоўніка можна назваць таленавітым і зацікаўленым справай.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

# ІНСТРУКЦЫЯ ЎЛАСНАЙ БЯСПЕКІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Адказваючы на пытанне, ці можа кліент сам выбраць страхавую кампанію пры заключэнні крэдытнага дагавора, спецыяліст растлумачыла, што ў інструкцыі гэта не прапісана. «Гэтыя нормы, накіраваныя на выкарыстанне паслуг трэціх асоб, у першую чаргу страхавых арганізацый і ацэншчыкаў, будуць урэгуляваныя. Яны ўжо сфармуляваны, узгоднены з усімі і будуць прапісаны ў зменах у Банкаўскі кодэкс. Там таксама ўводзіцца шэраг палажэнняў, накіраваных на абарону правоў спажыўцоў», — адзначыла яна.

**Гэтая мера накіравана на тое, каб банкі са свайго боку больш адэкватна ацэньвалі свае рызыкі, а з другога боку, каб неяк папярэдзіць жаданне насельніцтва бяздумна браць крэдыты, каб гэта жаданне супаставіць з нашымі магчымасцямі.**

Прадстаўнік рэгулятара расказала, што форма інфармацыі аб умовах крэдытавання павінна ўключаць звесткі пра суму крэдыту, памеры працэнтаў, тэрміны і парадак атрымання і вяртання крэдыту, магчымасці і ўмовы датэрміновага вяртання крэдыту. **Інфармацыя павінна быць аформлена ў выглядзе табліцы шрыфтам вызначанага выгляду (Times New Roman) памерам не менш за 12 пунктаў і не павінна перавышаць аднаго ліста.** Аналагічныя патрабаванні па ўжыванні шрыфту ўстаноўлены інструкцыяй і для афармлення крэдытнага дагавора. Пры згодзе патэнцыйнага крэдытаатрымальніка з усімі ўмовамі і падпісанні інфармацыі аб умовах крэдытавання названыя ўмовы павінны быць адлюстраваны ў крэдытным дагаворы.

Рэгулятар яшчэ раз удакладніў, што крэдыты фізічным асобам могуць быць выдадзены толькі ў беларускіх рублях.

## ПЛАЦЯЖЫ НЕ БОЛЬШ ЗА 40 ПРАЦЭНТАЎ АД ПРЫБЫТКУ

Адно з галоўных новаўвядзенняў датычыцца ацэнкі крэдытаздольнасці грамадзян. Для тых, хто прыйшоў у банк па спажывецкі крэдыт, будзе разлічвацца паказчык пазыковай нагрузкі. Плацяжы па крэдытах не павінны перавышаць 40 % ад сярэднямесячнага даходу. Да плацяжоў па аперацыях крэдытнага характару адносяцца плацяжы па крэдытных дагаворах, дагаворах пазыкі з мікрафінансавых арганізацый, дагаворах факторынгу і лізінгу.

«Пры вызначэнні даходаў заяўнікаў можа прымяняцца заяўны прынцып перадачы фізічнай асобай дадзенай інфармацыі», — сказана ў інструкцыі. Калі ж гаворка ідзе аб выдзяленні крэдыту на нерухомасць, то тут банкі будуць разлічваць яшчэ і паказчык забяспечанасці крэдыту.

Акрамя таго, цяпер банкі самі будуць вырашаць, як разлічваць даходы фізічных асоб пры выдачы спажывецкіх крэдытаў. «Цяпер пры выдзяленні крэдытаў банкі таксама павінны ацэньваць крэдытаздольнасць крэдытаатрымальніка. Гэта патрабаванне было ў ранейшай інструкцыі, і яно захоўваецца. Што датычыцца разліку гэтага паказчыка, то мы якраз і замацавалі норму, што банк сам вызначае методыку і якім чынам ён будзе пацвярджаць дакладнасць той інфармацыі, якую падае фізічная асоба», — растлумачыла Вольга Ілюкевіч. Нацыянальны банк пасля будзе ацэньваць, наколькі тая ці іншая методыка адэкватная.

## ЯК ПАЦВЕРДЗІЦЬ ДАХОД?

Прымаючы рашэнне аб выдачы крэдыту, банк можа ўлічваць усе даходы, якія кліент зможа пацвердзіць. «Калі вы зможаце пацвердзіць нейкія прыбыткі, у тым ліку працэнты ад дэпазіту, дзяржаўных каштоўных папер, даходы ад прысядзібнай гаспадаркі або здачы кватэры, то банк можа прыняць іх у разлік. Але яшчэ раз паўтаруся: якія даходы банк будзе ўлічваць — гэта справа самога банка», — заявіла спецыяліст. Нацбанк тут на фінансавыя ўстановы націснуць не можа.

Прадстаўнік Нацбанка асабліва падкрэсліла, што гаворка не пра тое, што вяртаецца норма аб прадстаўленні даведак аб даходах пры ацэнцы крэдытаздольнасці грамадзян. «Мы вывучылі гэты вопыт (прадстаўленне даведак) на практыцы і зразумелі, што гэта недастаткова эфектыўны і недастаткова гнуткі спосаб пацвярджэння даходаў. З улікам таго, якія цяпер тэхналогіі выкарыстоўваюцца ў банкаўскім бізнесе, ён не сучасны. Цяпер трэба ісці ў лічбавую будучыню, браць інфармацыю з тых баз даных, дзе яна дакладная і можа быць пацверджана трэцяй асобай», — адзначыла яна.

Пры гэтым Вольга Ілюкевіч удакладніла, што па тых крэдытных прадуктах, дзе банку неабходна больш увагі ўдзяляць ацэнцы крэдытнай рызыкі, даведкі захоўваюцца. «Асабліва калі гэта крэдыты на набыццё нерухомасці, дарагіх тавараў за кошт спажывецкіх крэдытаў на вялікія сумы — там банкі самі патрабуюць прадстаўленне даведкі аб даходах», — сказала яна.

Эксперт Нацбанка пракаментавала і пытанне з выдзяленнем крэдытаў на фінансаванне нерухомасці, пры прыняцці рашэння аб выдачы якога банкі павінны выкарыстоўваць паказчык забяспечанасці крэдыту. Нормамі інструкцыі банкі абмежаваныя ў выдзяленні сваім кліентам крэдытаў на нерухомасць у выпадку, калі сума крэдыту перавышае 90 % кошту жылля або іншага забеспячэння.

Пры гэтым інструкцыяй дапускаецца выдзяленне банкамі крэдытаў фізічным асобам у выпадку перавышэння парогавых значэнняў названых паказчыкаў пры ўмове, што аб'ём такіх крэдытаў не будзе перавышаць 10 % ад усіх крэдытаў адпаведнай групы (спажывецкіх крэдытаў і крэдытаў на нерухомасць).

Інструкцыя не змяшчае нормаў, якія абмяжоўваюць выдачу крэдытаў заяўніку (крэдытаатрымальніку), які мае пратэрмінаваную запазычанасць па раней выдадзеных яму крэдытах.

## УДАР НА АПЯРЭДЖАННЕ?

У свой час Нацыянальны банк казаў, што будзе ўводзіць меры рэгулявання пры вялікім усплёску павелічэння аб'ёмаў спажывецкіх крэдытаў. Час прыйшоў?

**«Калі вы зможаце пацвердзіць нейкія прыбыткі, у тым ліку працэнты ад дэпазіту, дзяржаўных каштоўных папер, даходы ад прысядзібнай гаспадаркі або здачы кватэры, то банк можа прыняць іх у разлік».**

На гэта прадстаўнік Нацбанка адзначыла, што бум пачаўся, а гэта сігнал да таго, што, хутчэй за ўсё, не кожны крэдытаатрымальнік здольны адэкватна ацаніць свае здольнасці ў пагашэнні крэдыту. І гэтая мера накіравана на тое, каб банкі са свайго боку больш адэкватна ацэньвалі свае рызыкі, а з другога боку, каб неяк папярэдзіць жаданне насельніцтва бяздумна браць крэдыты, каб гэта жаданне супаставіць з нашымі магчымасцямі. «Канкрэтна на лічбах разліку ў рэгулятара не было, але мы спадзяёмся, што па спажывецкім крэдытаванні будуць абмежаваныя апетыты тых людзей, якія сапраўды такія траты сабе дазволіць не могуць», — адзначыла Вольга Ілюкевіч.

Норма, якая датычыцца разліку паказчыкаў забяспечанасці крэдыту і пазыковай нагрузкі, уступіць у сілу з 1 мая 2018 года. Вольга Ілюкевіч адзначыла, што пры прыняцці гэтай нормы ўлічваўся сусветны вопыт. «Такія паказчыкі ўведзеныя ў многіх краінах, гэта не ноу-хау Беларусі, гэта агульнасусветная тэндэнцыя», — удакладніла яна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Эканамікс

## Нашы золатавалютныя рэзервы — амаль $7 млрд

**Міжнародныя рэзервовыя актывы краіны на 1 красавіка гэтага года, паводле папярэдніх звестак, склалі 6,994 млрд долараў (у эквіваленце), паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка Беларусі.**

За сакавік золатавалютныя рэзервы знізіліся на 98,8 млн долараў (на 1,4 %) пасля росту ў лютым на 616,1 млн долараў (на 9,5 %). Зніжэнне ўзроўню актываў па выніках сакавіка абумоўлена планавым пагашэннем урадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на агульную суму каля 415 млн долараў.

Дарэчы, падтрыманню ўзроўню міжнародных актываў краіны ў сакавіку спрыялі паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, паступленне сродкаў ад продажу на ўнутраным рынку Нацыянальным банкам і Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, купля замежнай валюты на таргах акцыянернага таварыства «Беларуская валютна-фондавая біржа», а таксама павелічэнне кошту манетарнага золата.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Прагноз — стабільны

**Эксперты S&P чакаюць захавання эканамічнага росту і нізкага ўзроўню інфляцыі ў Беларусі.**

Рэйтынгавае агенцтва S&P пацвердзіла доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя суверэнныя крэдытныя рэйтынгі Беларусі па абавязацельствах у замежнай і нацыянальнай валюце на ўзроўні «B», прагноз «стабільны», паведамілі ў Мінфіне.

Адпаведны прагноз адлюстроўвае чаканні аналітыкаў аб умераным скарачэнні знешніх дысбалансаў пры захаванні кансерватыўнай бюджэтнай палітыкі на працягу наступных 12 месяцаў, а таксама ўпэўненасць агенцтва ў здольнасці беларускага ўрада забяспечыць рэфінансаванне даўгавых абавязацельстваў, тэрмін пагашэння якіх надыходзіць пасля гэтага года. Агенцтва адзначыла шэраг значных крокаў, зробленых Саўмінам і Нацбанкам у частцы ўзмацнення жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі і пераходу да больш гнуткага рэжыму абменнага курса. Эксперты S&P чакаюць захавання эканамічнага росту і нізкага ўзроўню інфляцыі ў найбліжэйшыя гады.

**(Ул. інф.)**

## Паляпшаем жывёлагадоўлю

### з дапамогай сусветнага гранта

**У супрацоўніцтве з Сусветнай арганізацыяй фермераў кампанія Bayer шукае прафесіяналаў ва ўсім свеце, якія ўкараняюць інавацыі ў галіне гадоўлі буйной рагатай жывёлы.**

Care4Cattle — гэта глабальны грант, які дае інструменты і рэсурсы для наватараў у галіне ўтрымання буйной рагатай жывёлы, прапаноўвае прамую і мэтанакіраваную падтрымку фермерам і ветэрынарам. У межах гранта можна пачаць або ўдасканаліць інавацыйныя і практычныя спосабы павышэння якасці ўтрымання малочнай і мясной жывёлы на ферме. Агульнае фінансаванне праекта — 30 000 еўра.

З атрыманых заявак група незалежных экспертаў з акадэмічных колаў і дзяржаўнага сектара, а таксама прадстаўнікі Сусветнай арганізацыі фермераў і Bayer будуць выбіраць праекты, якім выдзеляць фінансаванне і адпаведны аб'ём гранта.

Падаць адпаведныя заяўкі могуць фермы і фермеры; ветэрынары-практыкі, якія цесна супрацоўнічаюць з фермерамі ў сферы жывёлагадоўлі, выпускнікі і даследчыкі ў галіне ветэрынарыі, жывёлагадоўлі або сельскагаспадарчай навукі, якія ўдзельнічаюць у фермерскіх гаспадарках, у іх даследаваннях па ўтрыманні буйной рагатай жывёлы.

Для таго каб паспрабаваць атрымаць грант, трэба запоўніць анлайн-заяўку (на англійскай мове) па спасылцы: http://animalhealth.bayer.com/en/commitment-responsibility/care4cattle/. Да яе трэба дадаць праектнае абгрунтаванне (максімум пяць старонак), у якім будуць выкладзены дакладныя мэты праекта, дэталі лагістыкі, уключаючы прапанаванае выкарыстанне гранта або этапы/вынікі ўжо існуючага праекта, а таксама суправаджальныя малюнкі (метадычныя рэкамендацыі). Падаць заяўку можна да 25 чэрвеня 2018 года.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

## Дзяржадоўг паменшыўся

### Знешні дзяржаўны доўг нашай краіны на 1 сакавіка склаў 16,4 млрд долараў

**Такім чынам ён зменшыўшыся з пачатку года на 278,8 млн долараў (з улікам курсавых розніц), або на 1,7 %, паведамілі спецыялісты Міністэрства фінансаў.**

Пагашэнне знешняга дзяржадоўгу з пачатку года склала 1 млрд 64,8 млн долараў, з якіх 800 млн долараў — еўрааблігацыі, 175,3 млн долараў — банкам КНР, 82,2 млн долараў — ураду Расіі, 7,3 млн долараў — міжнароднаму банку рэканструкцыі і развіцця.

Эксперты Мінфіна паведамляюць, што ўвесь дзяржаўны доўг Беларусі на пачатак сакавіка склаў 41,4 млрд рублёў і зменшыўся ў параўнанні з пачаткам года на 791,5 млн рублёў, або на 1,9 %. Унутраны дзяржаўны доўг на гэтую дату склаў 9,2 млрд рублёў, павялічыўшыся з пачатку года на 70,9 млн рублёў (з улікам курсавых розніц), або на 0,8 %.

За студзень—люты размешчана ўнутраных валютных дзяржаблігацый для юрыдычных і фізічных асоб на суму 63,3 млн долараў. Разам з тым, пагашана валютных дзяржаўных аблігацый для гэтых асоб на суму, эквівалентную 51,8 млн долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Эканомія па падатках прывяла да крымінальнай справы

**У суд Магілёўскага раёна накіравана крымінальная справа па абвінавачанні кіраўніка і галоўнага бухгалтара аднаго з аграпрамысловых прадпрыемстваў ва ўхіленні ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры.**

— Абодва фігуранты з карыслівых памкненняў наўмысна ўносілі заведама хлуслівыя звесткі ў падатковыя дэкларацыі. За перыяд са жніўня 2016-га па студзень мінулага года яны ўхіліліся ад выплаты ў бюджэт амаль на 130 тысяч рублёў падатку на дабаўленую вартасць, — паведаміла **старшы пракурор аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Марына ЦІТОВА.**

Дырэктару і галоўнаму бухгалтару прадпрыемства прад'яўлена абвінавачанне па частцы 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якое прадугледжвае пакаранне да сямі гадоў пазбаўлення волі. Абвінавачаныя ўжо паспелі цалкам пакрыць шкоду, нанесеную дзяржаве. З іх узятая падпіска аб нявыездзе, а на іх маёмасць, агульным коштам болей чым 47 тысяч рублёў, накладзены арышт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Інавацыі

# ВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ

**Новае сумеснае прадпрыемства «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы» створана Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і найбуйнейшай кітайскай авіяцыйнай кампаніяй AVIC. Яно будзе працаваць на базе Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».**

На тэрыторыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень» прайшоў устаноўчы сход кітайска-беларускага СЗАТ «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы» — трохбаковая сустрэча, на якой прысутнічалі прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка. На відэасувязі знаходзіліся кіраўнікі кітайскай кампаніі AVIC. Па выніках сустрэчы быў зацверджаны статут, а таксама абраны органы кіравання новага сумеснага прадпрыемства — савет дырэктараў і генеральны дырэктар.



**На тэрыторыі індустрыяльнага парка прайшоў устаноўчы сход кітайска-беларускага СЗАТ «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы».**

Як адзначыў на мерапрыемстве **першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Сяргей ЧЫЖЫК,** у ходзе падрыхтоўчых мерапрыемстваў былі ўлічаны інтарэсы кожнага з бакоў. «Спадзяёмся, што, аб'яднаўшы наш вопыт, мы зможам ствараць канкурэнтаздольныя вырабы, якія будуць карыстацца попытам ва ўсім свеце», — рэзюмаваў ён.

**Генеральны дырэктар новага кітайска-беларускага СЗАТ «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы» Юрый ЛЕАНАВЕЦ** расказаў, што дзейнасць новага аб'яднання будзе накіравана на распрацоўку ўласнай высокатэхналагічнай прадукцыі, засваенне серыйнай вытворчасці як сваіх распрацовак, так і наяўных у карпарацыі AVIC. Прасоўваць прадукцыю плануецца не толькі ў Беларусі, але і на сусветны рынак, з акцэнтам на краіны СНД.

Дарэчы, AVIC — гэта найбуйнейшая кітайская дзяржаўная авіяцыйная кампанія, якая выпускае сёння больш за 60 відаў лятальных апаратаў, актыўна інвесціруе ў распрацоўку авіяцыйнай тэхнікі і кампанентаў па ўсім свеце. У рэйтынгу Fortune Global 500 займае 159-е месца. Параўнальная па абароце з кампаніямі «Боінг» і «Эйрбас».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навукі, культуры і сацыяльным развіцці пятага склікання КУРЛОВІЧА Аляксандра Мікалаевіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

## Извещение о проведении 11 мая 2018 года торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Здание «Административно-бытовых и вспомогательных помещений МАЗ по ул. Машиностроителей» общей площадью 12555,8 кв. м (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/U-63596, назначение: здание административно-хозяйственное); инженерные сети (общие затраты); теплотрасса; наружные сети ливневой канализации; наружные сети фекальной канализации, наружные сети водопровода; ограждение АБК А3; благоустройство; логотип ЗУБР; система ПТО ПТ 7637; монорельс ПТ 7735; монорельс ПТ 7648; кран подвесной мод. ПТ 6946-03.00.000 (5 шт.); шкаф ШРС 1-26 |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, пр-т Партизанский, 154А |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 2,3887 га, кадастровый номер 500000000002009005, назначение – земельный участок для обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 11 073 269,70 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 600 000,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 11 мая 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 12.04.2018 по 10.05.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

## ОАО «Могилевский завод «Строммашина» извещает о проведении 26 апреля 2018 года в 11.00 повторного открытого аукциона по продаже имущества в городе Могилеве по улице Первомайская, 77

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 700/С-49711, общ. площадью 2257,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000004000527 по адресу г. Могилев, ул. Первомайская, 77/14 (назначение – здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, наименование – Дом спорта) | **848 880,00** | 84 888,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 700/С-49733, общ. площадью 3035,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000004000527 по адресу г. Могилев, ул. Первомайская, 77/2 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание инженерного корпуса) | **2 818 692,00** | 281 869,20 |

**Продавец:** ОАО "Могилевский завод «Строммашина».

Организатор торгов – ОАО «Могилевский завод «Строммашина» в лице управляющего по делу о банкротстве Борейко Д. И.

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет ОАО «Могилевский завод «Строммашина»: р/с BY50BPSB30121193521289330000, Региональная дирекция № 600 по Могилевской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 700028385, назначение платежа: «задаток за участие в аукционных торгах лот №...»;

**2.** Подать заявление по установленной форме с приложением необходимых документов. Документы принимаются **с 10 апреля 2018 г.** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, каб. юр. отдела, 3-й эт.), в рабочие дни с 09.00 до 12.45 и с 13.45 до 16.30, тел. 29-08-67.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24 апреля 2018 г. в 16.00.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Подача документов по почте не допускается.**

**Для участия в аукционе предоставляются:**

– документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

– юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 85 | 30 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 549 | 55 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 32 793 | 20 530 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 1 936 | 2 284 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 19 | 7 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 9 | 47 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **65 064** | **40 516** |
| **БАЛАНС** | **300** | **70 079** | **47 369** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2017 года** | **31 декабря 2016** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 900 | 900 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 153 | 153 |
| Добавочный капитал | 450 | 5 042 | 5 075 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (3 676) | (3 950) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **2 419** | **2 178** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 14 803 | 9 728 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | |
| Доходы будущих периодов | 540 | | |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **14 803** | **9 728** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 851 | |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | 99 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 51 891 | 35 225 |
| В том числе: | | - | - |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 24 065 | 14 707 |
| по авансам полученным | 632 | 26 238 | 13 896 |
| по налогам и сборам | 633 | 137 | 4 848 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 160 | 398 |
| по оплате труда | 635 | 318 | 586 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 51 | 53 |
| прочим кредиторам | 638 | 922 | 737 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 115 | 139 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **52 857** | **35 463** |
| **БАЛАНС** | **700** | **70 079** | **47 369** |

**ОТЧЕТ**
**о прибылях и убытках за январь – декабрь 2017 г.**

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 44 635 | 62 987 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (38 404) | (55 555) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 6 231 | 7 432 |
| Управленческие расходы | 040 | (2 965) | (4 296) |
| Расходы на реализацию | 050 | | |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 3 266 | 3 136 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 8 467 | 10 741 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (10 029) | (16 508) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 1 704 | (2 631) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 416 | 471 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 369 | 426 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | | |
| проценты к получению | 103 | - | |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 47 | 45 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (369) | (376) |
| В том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (362) | (376) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (7) | |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 1 906 | 1 208 |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 1 902 | 1 207 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 4 | 1 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (3 623) | (2 711) |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (1 448) | (1 233) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (2 166) | (1 478) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (9) | |
| **Наименование показателей** | **Код строки** | **За январь – декабрь 2017 года** | **За январь – декабрь 2016 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | (1 670) | (1 408) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 34 | (4 039) |
| Налог на прибыль | 160 | | |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | 225 | |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (18) | (74) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 241 | (4 113) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 241 | (4 113) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Э. Д. Сычиков
Главный бухгалтер Е. В. Дашкевич
14 марта 2018 г.

**Информацию об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2018 г.**

4. Доля государства в уставном фонде эмитента ___0_____ (всего в процентах), в том числе:

| Вид собственности | Количество акций, штук | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Республиканская | - | - |
| Коммунальная - всего | - | - |
| В том числе: | | |
| областная | - | - |
| районная | - | - |
| городская | - | - |

5. Количество акционеров – всего 1115.
В том числе: юридических лиц – 7, из них нерезидентов Республики Беларусь – 2, физических лиц – 1108, из них нерезидентов Республики Беларусь – 25.
6. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | - | - |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | X | X | X |
| типа ________ | рублей | - | - |
| типа________ | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | - | - | - |
| типа ________ | рублей | - | - |
| типа________ | рублей | - | - |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | - | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | - | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | - | X |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 8,06 | 21,06 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | - | - |
| В том числе: поступившие в распоряжение общества: | | - | - |

| дата зачисления акций на счет "депо" общества | количество акций | штук | срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества |
|---|---|---|---|
| - | - | - | - |
| - | - | - | - |
| - | - | - | - |

| | | | |
|---|---|---|---|
| приобретенные в целях сокращения общего количества акций: | - | - | - |

| дата зачисления акций на счет "депо" общества | количество акций | штук | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | - | X |
| - | - | - | - | X |
| - | - | - | - | X |

8. Среднесписочная численность работающих (человек) – 402.

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): строительство трубопроводов.

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2017 год: 29 марта 2018 г.

13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): в своей деятельности Общество руководствуется Правилами корпоративного поведения. Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг утвержден Решением Совета директоров 30.10.2009 г.

14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет www.beltps.by/

**Годовой отчет эмитента ценных бумаг за 2017 год**
**ОАО "СОТРУДНИЧЕСТВО"**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Западный промузел, ТЭЦ-4, пом. 183.**
**УНП 390185556.**
**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2018 г.**

( в тыс. руб.)

| АКТИВ | Код строки | На конец периода | На начало периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | 190 | 1 297 | 1 304 |
| II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | 290 | 5 945 | 5 764 |
| БАЛАНС | 300 | 7 242 | 7 068 |
| **ПАССИВ** | **Код строки** | **На конец периода** | **На начало периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | 490 | 13 | 16 |
| IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | 590 | 7 142 | - |
| V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | 690 | 87 | 7 052 |
| БАЛАНС | 700 | 7 242 | 7 068 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 января 2018 г.**

(в тыс. руб.)

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 23 | 39 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (4) | (22) |
| Валовая прибыль | 030 | 19 | 17 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 2 | 2 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | - | (21) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | - | - |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (3) | (21) |
| Налог на прибыль | 160 | | |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (3) | (21) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |

**ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | - | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 0,13 | 0,16 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | - | - |
| **ИНФОРМАЦИЯ О ЗАДОЛЖЕННОСТИ:** | | | |
| Просроченная дебиторская задолженность | тыс. руб. | - | - |
| Просроченная кредиторская задолженность | тыс. руб. | - | - |

Количество акционеров всего – 2, количество юридических лиц, входящих в состав акционеров – 2.
Среднесписочная численность работников – 5 человек.
Основыные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: реализация проектов, связанных со строительством зданий (41100).
Общее годовое собрание акционеров проведено 28 марта 2018 года.
По мнению аудиторской организации ООО "Аудит 3Д", бухгалтерская отчетность ОАО "Сотрудничество" достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО "Сотрудничество" на 31.12.2017 г., а также на финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО "Сотрудничество" за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Управляющий О. А. Латыпов
Главный бухгалтер И. В. Палитко

## Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Молочный Мир», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 89 15 мая 2018 года

| | |
|---|---|
| Вид аукциона | Открытый |
| Предмет аукциона | Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-8480 (магазин) общей площадью 259,1 кв. м. Фундамент – железобетонный, стены и перегородки- железобетонные панели, кровля – совмещенная рулонная, междуэтажные перекрытия – железобетонные плиты. Полы – мозаичные, плитка, линолеум. Окна – витражные, остекленные. Отопление – центральное. Имеются водопровод и канализация |
| Начальная цена продажи | **199 785,91 рублей** (с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 440100000002002858 площадью 0,2314 га (63/2500 доли) |
| Месторасположение земельных участков | г. Гродно, ул. Максима Горького, д. 89 |
| Продавец | Открытое акционерное общество «Молочный Мир», г. Гродно, ул. Гаспадарчая, 28, тел. 8 (0152) 430172, 453926 |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования |
| Сумма задатка | 9 989,30 рублей |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел. 720537, 720546 |
| Дата проведения аукциона | 15 мая 2018 года |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 |
| Дата и время начала приема документов | 9 апреля 2018 года, 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 10 мая 2018 года, 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ чБеларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

■ Спорт-тайм

## НЕ ТОЛЬКІ ЗАВАЯВАЦЬ, АЛЕ І АДСТАЯЦЬ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра развязку чэмпіянату краіны па хакеі, вынікі таварыскіх матчаў гандбольнай зборнай і другі тур чэмпіянату Беларусі па футболе.**

**1.** ***Хакеісты «Нёмана» абаранілі тытул чэмпіёнаў Беларусі ў экстралізе, абыграўшы ў шостым матчы фінальнай серыі плэй-оф мінскае «Юнацтва» — 3:2*** (вынік фінальнай серыі 4:2).

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка** павіншаваў каманду хакейнага клуба «Нёман» з упэўненай і прыгожай перамогай у адкрытым чэмпіянаце Беларусі па хакеі з шайбай у экстралізе сезона-2017/2018 і заваяваннем Кубка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. «Гэта дасягненне — вынік сур'ёзнай працы не толькі спартсменаў, але і ўсіх спецыялістаў і трэнераў, якія забяспечвалі неабходныя ўмовы для паспяховага выступлення каманды. Ва ўпартым і напружаным супрацьстаянні з мінскім «Юнацтвам» вы даказалі, што ў шэрагах «Нёмана» сабраліся сапраўдныя майстры, здольныя на працягу ўсяго сезона захоўваць выдатную спартыўную форму, байцоўскія якасці і нацэленасць на вынік», — гаворыцца ў віншаванні.

Камандзе хакейнага клуба «Нёман» Аляксандр Лукашэнка пажадаў моцнага здароўя і новых перамог.

— *У вырашальнай стадыі барацьба за ганаровы трафей аказалася вельмі цяжкай. У шостым матчы, лічу, мы мелі перавагу, зрабілі правільныя высновы пасля паражэння ў Гродне. Адзначу, што чэмпіёнства заўсёды трохі прасцей заваяваць, чым яго адстаяць. Нам гэта ўдалося,* — адзначыў пасля матча **галоўны трэнер «Нёмана» Сяргей ПУШКОЎ.**

— *Каментарыяў у мяне няшмат: перамагае наймацнейшы. «Нёман» быў нацэлены на перамогу, змагаўся, закідваў. А ў нас, на жаль, многія так і не зразумелі, што гэта плэй-оф,* — сказаў **Міхаіл ЗАХАРАЎ, рулявы «Юнацтва».**

Кубак Прэзідэнта ўручылі гродзенцам на «Чыжоўка-Арэне» міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук і старшыня Федэрацыі хакея Беларусі Сямён Шапіра.

Адзначым, што для хакейнага клуба «Нёман» гэта сёмы тытул у гісторыі. Раней каманда з Гродна станавілася пераможцам чэмпіянату ў 1998, 1999, 2001, 2013, 2014, 2017 гадах. Каманда Сяргея Пушкова трэці раз прыме ўдзел у хакейнай Лізе чэмпіёнаў, дзе выступіць і мінскае «Юнацтва», што атрымала права згуляць у гэтым прэстыжным турніры, выйграўшы ў студзені Кантынентальны кубак.

**2.** ***Гандбалісты зборнай Беларусі няўдала правялі таварыскія матчы ў гасцях у каманды Славеніі.*** У першай сустрэчы ў Трбоўле беларусы саступілі з лікам 29:35, а ў другой у горадзе Лашка — 23:27.

— *Мы засмучаны, што двойчы прайгралі. Але я задаволены, што такія матчы ў нас былі. Яны прымушаюць праяўляць характар, вучаць дзейнічаць супраць агрэсіўнай жорсткай абароны, якую прымяняе зборная Славеніі,* — каментуе вынік **галоўны трэнер зборнай Беларусі Юрый ШАЎЦОЎ.** — *Былі сур'ёзныя агрэхі ў абароне, выкліканыя тым, што мы даволі даўно не гулял і сёе-тое з ранейшых напрацовак прыйшлося аднаўляць на хаду. Перад паўторным матчам мы паспелі патрэніравацца, грунтоўна папрацавалі з відэа. Таму і гульня па змесце атрымлівалася значна лепшай.*

Нагадаем, за права гуляць на чэмпіянаце свету ў 2019 годзе наша зборная ў чэрвені пазмагаецца з гандбалістамі з Аўстрыі.

**3.** ***Завяршыўся другі тур чэмпіянату краіны па футболе.*** Мінскае «Дынама» і «Іслач» разышліся мірам — 0:0, «Мінск» саступіў БАТЭ — 0:2, «Дняпро» (Магілёў) перайграў «Гомель» — 1:0, «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) з такім жа лікам перамог «Смалявічы» — 1:0, «Віцебск» быў мацнейшы за «Шахцёр» (Салігорск) — 2:1, матч «Слуцка» і «Нёмана» (Гродна) скончыўся з лікам 1:1, «Тарпеда» (Мінск) перайграў «Гарадзею» — 1:0, «Дынама» (Брэст) быў мацнейшы за «Прамень» (Мінск) — 2:1

Павел БАШКІН:

# «Пасля Іспаніі я прыехаў у Беларусь і задаволены, што так склалася маё жыццё»

### Спартыўны дырэктар БГК імя Мяшкова пра тое, як горад над Бугам стаў гандбольнай сталіцай

**Павел Башкін — ураджэнец Астрахані, у мясцовым гандбольным «Дынама» і пачалася яго кар'ера. У 2004-м разам са зборнай Расіі ён стаў бронзавым прызёрам Алімпійскіх гульняў, а праз два гады адправіўся на легіянерскі хлеб спачатку ў Славенію, у тамашні клуб «Гарэнне», а затым у іспанскі «Лагронья». У 2010-м Башкіну паступіла прапанова ад брэсцкага БГК імя Мяшкова. Павел даў згоду. І вось ужо восьмы год ён жыве і працуе ў Беларусі. Яго гульнявая кар'ера ўжо ў мінулым, зараз Павел Яўгенавіч — спартыўны дырэктар аднаго з найлепшых клубаў краіны. Чаму ён вырашыў застацца ў Брэсце і ці стаў гэты горад яму родным, чым адрозніваюцца беларусы ад расіян і з якімі пачуццямі Павел успамінае Алімпіяду, ён расказаў у сваім інтэрв'ю.**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***— У Беларусь вы пераехалі 8 гадоў таму, былі раней знаёмыя з Брэстам?***

— Яшчэ са школьных часоў ведаў пра Брэст і яго знакамітую Брэсцкую крэпасць, а таксама пра Белавежскую пушчу. Калі мяне паклікалі ў БГК, у клубе працаваў трэнер, пад кіраўніцтвам якога я гуляў да ад'езду ў свой першы замежны калектыў — «Гарэнне». Менавіта Аляксей Пчалякоў запрасіў мяне, калі БГК спатрэбіўся гулец на пазіцыю правага крайняга. У той час якраз заканчваўся кантракт у Іспаніі, дзе я, нягледзячы на траўмы, з-за якіх прапускаў гульні, быў у спісе найлепшых бамбардзіраў унутранага чэмпіянату. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ўжо тады ставіў перад сабой амбіцыйныя задачы, менавіта гэта адыграла ролю пры маім выбары.

***— Ці можна сказаць, што Брэст стаў для вас родным?***

— Вядома! І горад, і каманда даўно сталі роднымі. У мяне пакуль няма планаў з'язджаць. Хоць я заўсёды вельмі лёгка пераязджаў з краіны ў краіну.

***— А як успамінаеце гады жыцця ў Славеніі і Іспаніі?***

— Этап у Славеніі — мой першы замежны вопыт. Здзівіла стаўленне гульцоў да спорту, да сваіх прафесійных абавязкаў. Калі казаць пра заняткі па фізічнай падрыхтоўцы, то там не патрэбны трэнер, у кожнага ёсць свой план работы: гульцу паставілі задачу, і толькі ён сам сябе кантралюе. Гэта адрознівае нас ад еўрапейцаў: нашы ўсё ж спрабуюць «згультаяваць», таму маюць патрэбу ў кантролі. Што датычыцца побыту, то ў Славеніі людзі атрымліваюць асалоду ад жыцця, выдатнага



***— Якія першыя ўражанні засталіся ад горада, бо да гэтага вы шмат часу правялі ў Еўропе.***

— Вядома, Брэст адрозніваецца ад еўрапейскіх гарадоў: архітэктурай, планаваннем гарадской прасторы, ладам жыцця гараджан. У той жа час Брэст, як і Беларусь у цэлым, вылучае высокі ўзровень бяспекі — тут, напрыклад, не перажываючы, адпускаюць дзяцей гуляць. У камандзе я таксама адаптаваўся хутка і адчуў камфортную атмасферу.

***— Расіяне і беларусы моцна адрозніваюцца адзін ад аднаго?***

— Калі ўзяць балканцаў або іспанцаў і нас, славян, то можна казаць пра нейкія адрозненні, а вось у беларусаў і расіян, мне здаецца, усё ж больш агульнага. Калі ўсё ж такі параўноўваць, то беларусы, напэўна, больш працавітыя, цярплівыя, больш увагі аддаюць добраўпарадкаванню сваёй тэрыторыі, сочаць за сваімі дамамі і садамі. Тут заўсёды дагледжана і акуратна.

камфортнага клімату, спакойна плануюць свой адпачынак на год наперад, таму што ўсё роўна і стабільна.

Іспанія — гэта зусім іншая краіна, яна адрозніваецца тым, што людзі, якія прыязджаюць туды жыць, інтэгруюцца ў культуру, яны выконваюць мясцовыя традыцыі, час прыёму ежы, гэта значыць, падладжваюцца пад мясцовых. Што, напрыклад, не характэрна для Германіі, куды прыязджаюць нашы суайчыннікі і ладзяць свае вячоркі, па-свойму святкуюць Новы год, ёсць рускія крамы. Для мяне Іспанія — гэта самая лепшая краіна для жыцця. Мора, сонца, горы, ежа — усё быццам створана для таго, каб атрымліваць асалоду. Хоць менавіта пасля Іспаніі я прыехаў у Беларусь і задаволены, што так склалася маё жыццё.

***— Вы ведаеце шмат моў?***

— У нас інтэрнацыянальная каманда, і ў сілу сваіх прафесійных абавязкаў я часта кантактую як са сваімі гульцамі, так і з прадстаўнікамі гандбольных ліг, клубамі, агентамі. Свабодна размаўляю, вяду перапіску на балканскіх мовах — славенскай, сербскай і харвацкай, разумею македонскую, яны ў прынцыпе падобныя, але ёсць асаблівасці. Напрыклад, калі славенцы разумеюць харватаў, то харваты славенцаў — не. Даволі хутка — недзе за паўгода — асвоіў іспанскую. Безумоўна, не абыходзіцца і без англійскай.

***— А што з беларускай?***

— Думаю, працэнтаў на 80 я разумею беларускую мову. БГК актыўна прасоўвае родную мову, выкарыстоўваючы ў рэкламных кампаніях, сацыяльных праектах, нават здымалі відэаролік, дзе разам з салістамі легендарных «Верасоў» гульцы каманды праспявалі знакамітую «Завіруху». Да таго ж я гляджу некаторыя спартыўныя трансляцыі з каментарамі на беларускай мове.

***— Са зборнай Расіі вы атрымалі медаль Алімпійскіх гульняў — 2004, але на пляцоўцы не згулялі. Гэта пакінула дваякае ўражанне аб турніры?***

— Я лічу, што нават трапіць у алімпійскую каманду — ужо заслуга, таму што туды бяруць усяго 15 гульцоў. Я быў менавіта тым 15-м чалавекам, які не трапляў у заяўку, але чакаў свайго часу. Тады мне перашкодзіла траўма, партнёры па камандзе супакойвалі, маўляў, алімпійская зборная — гэта ўжо крута. Сёння я сапраўды спакойна стаўлюся да гэтай сітуацыі, рады, што ўдалося пабываць на найбуйнейшым сусветным турніры, убачыць многіх зорак спорту, алімпійскую вёску, наогул, зразумець, як уладкавана Алімпіяда. Гэта ўнікальны вопыт.

***— Вы завяршылі кар'еру з-за траўмы?***

— Так, як і большасць гульцоў. Гэта быў другі год майго знаходжання ў Брэсце. У сярэдзіне сезона стаў адчуваць, што цела не дазваляла рабіць тое, што хацелася галаве. Для ўсіх спартсменаў заканчваць кар'еру цяжка, думаю, усе спрабуюць адтэрмінаваць свой сыход. Мне пашанцавала, таму што атрымаўся вельмі добры пераход ад гульца да спартыўнага функцыянера. На той момант я ўжо асталяваўся ў Брэсце, палюбіў гэты горад, прыкіпеў да клуба і пераязджаць не хацелася. Удзячны клубу за магчымасць застацца ў прафесіі і працягнуць займацца любімай справай.

***— Падымацца па кар'ернай лесвіцы вы пачалі даволі хутка.***

— Пасля таго як перастаў гуляць, пачынаў з пасады адміністратара каманды, паралельна дапамагаў у трэніровачным працэсе галоўнаму трэнеру Астраўскасу, а праз год стаў спартыўным дырэктарам. Не магу сказаць, што гэты пераход даўся мне лёгка. Проста я імкнуся хутка вучыцца і адаптавацца да новых умоў.

Галоўны мой абавязак сёння — гэта падбор кадраў для асноўнай каманды і рэзерву. Акрамя таго, я займаюся арганізацыйна-бытавымі пытаннямі дзейнасці каманды: падчас выязных матчаў і вучэбна-трэніровачных збораў на мне ўся лагістыка — ад аўтобуса да чартара, а таксама пражыванне, харчаванне, арганізацыя трэніровак і рашэнне іншых пытанняў.

***— Сёння многія менавіта Брэст называюць гандбольнай сталіцай Беларусі.***

— І я з гэтым згодзен! Альтэрнатывы няма.

***— Як гэтага атрымалася дасягнуць?***

— У першую чаргу мы сталі больш старанна падбіраць якасных гульцоў і трэнерскі склад. Зразумела, што тут працавалі розныя спецыялісты: і літоўцы, і расіяне, і харваты. Яны многае прыўносілі ў клуб. Удзел у SEHA-лізе паспрыяў развіццю клуба, БГК сталі пазнаваць у Еўропе, таму добрыя гандбалісты перасталі баяцца ехаць у Беларусь, зніклі пытанні пра месцазнаходжанне краіны.

Мы ідзём наперад крок за крокам, не спыняючыся, ёсць стратэгічныя мэты і задачы, разумеем, што адразу выйсці ў фінал чатырох Лігі чэмпіёнаў немагчыма, але клуб упэўнена рухаецца да сваёй мэты.

Да БГК значна вырасла цікавасць гледачоў. Па-першае, палепшыліся вынікі каманды, мы сталі гуляць на ўзроўні топ-клубаў. Па-другое, маркетынгавая служба шмат робіць для прасоўвання клуба і для балельшчыкаў, каб ім было камфортна праводзіць час на арэне.

***— Да спраў сённяшніх. Гульні са СКА для БГК у цяперашнім сезоне складваюцца не так лёгка, як у мінулым.***

— Я думаю, перш за ўсё гэта звязана з тым, што на гульцах сёлета ляжыць вельмі вялікая нагрузка. Так, мы падзяляем склад, недзе гуляюць другія нумары, але не заўсёды атрымліваецца правесці паўнавартасную падрыхтоўку да кожнага матча. Да таго ж СКА сёлета таксама дадаў у гульні. Хоць перавага пакуль усё роўна на нашым баку, засталося тры матчы, два з іх адбудуцца ў Брэсце, я думаю, усё ў нас павінна атрымацца.

***— Зразумела, што некаторыя галоўныя гульні ў БГК яшчэ наперадзе, але можна ўжо падвесці маленькія вынікі цяперашняга сезона?***

— У Лізе чэмпіёнаў нашай задачай было выйсці ў 1/8 фіналу, у SEHA-лізе ніколі не здымаецца задача перамагчы, ну і, вядома, чэмпіянат і Кубак Беларусі. У канцы мая, калі падымем кубак над галавой, тады скажам, што ўсе задачы выкананы. У нашым клубе мы ўсе максімалісты.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ,**
*г. Брэст.*

# АД ЗЯМЛІ ДА НЯБЁС

**«Святло Хрыста», «Вялікдзень у Іерусаліме», «Пераход», «Да Анёла-захавальніка», «Вербніца»... Назвы карцін Святланы Наздрын-Платніцкай адразу ж сведчаць пра накіраванасць яе позірку ў бок хрысціянства. Апошнія 20 гадоў яна так часта звярталася да евангельскіх сюжэтаў, што палотнаў набралася на выстаўку, аб'яднаную тэмай «Зямля і неба».**



Архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі СЦЯФАН і мастачка Святлана НАЗДРЫН-ПЛАТНІЦКАЯ.



Святы Спірыдон Трыміфунцкі.

— ЗЯМЛЯ — гэта гарызанталь нашага быцця. Гэта наша Палессе, нашы палі, вельмі прыгожая прырода. Неба — гэта вертыкаль. Імкненне да духоўнага развіцця. Такім чынам атрымліваецца крыж. І чалавек усё жыццё на гэтым крыжы. Яму хочацца часцей пабыць у гарызанталі, а трэба імкнуцца да вертыкалі. Важна прымусіць сябе працаваць, каб нешта засталося пасля.

Хрысціянскія матывы ў творчасці члена Беларускага саюза мастакоў і члена савета Беларускага саюза дызайнераў Святланы Наздрын-Платніцкай спачатку прысутнічалі неасэнсавана. Гаворыць, садзейнічалі іх узнікненню і шматлікія паломніцкія паездкі:

— Асабліва мне спадабаўся Валаамскі манастыр. Мы там працавалі два тыдні, было даволі цяжка, і настрой быў розны. Завяршыў серыю паломніцтваў Іерусалім. На Святой зямлі атрымалася пабываць якраз на Вялікдзень. Потым я паўгода знаходзілася ў нейкім блажэнным стане, калі нічога не раздражняе. Пасля з'явіліся работы, натхнёныя той паездкай. Будзем спадзявацца, што Бог дазволіць яшчэ нешта стварыць на гэтую тэму.

Карціны мастачкі з Гомеля выстаўляліся ў духоўна-асветніцкім цэнтры Аляксандра-Неўскай лаўры Санкт-Пецярбурга. Асаблівую ўвагу звяртае на сябе серыя партрэтаў «Будучыя святыя ў зямным жыцці». Адна з работ прысвечана святому праведнаму Іаану Кармянскаму. Цікава, што карціна напісана па адзінай прыжыццёвай выяве святара — саматканым пакрывале пачатку XX стагоддзя. А вось цёмна-чырвоны аксаміт даў ідэю стварэння падвоенага партрэта-дыялогу вялікай княгіні Лізаветы Фёдараўны. На карціне — лёс: ад бліскучага шлюбу да падзвіжніцтва і пакутніцкай смерці.

— У работах Святланы Наздрын-Платніцкай відавочнае перажыванне пра зямлю, якая яе вырасціла, — адзначае архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан. — Выявы нясуць у сабе глыбокі сэнс духоўнасці. У іх ёсць спадзяванне на вечнае жыццё душы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Даты | Падзеі | Людзі

**10 КРАСАВІКА**

У краіне

**1590** год — мястэчка Любча (сёння — гарадскі пасёлак у Навагрудскім раёне) атрымала права на самакіраванне і герб — на блакітным полі сярэбраная падкова з трыма залатымі крыжамі; у сярэдзіне падковы дзве рыбіны. У 1644 годзе, дзякуючы новым уладальнікам мястэчка князям Радзівілам, Любча атрымала новы герб — на блакітным полі брама з дзвюма вежамі; паміж вежамі ўзброены рыцар, у правай руцэ ў якога меч, у левай — шчыт.

**1900** год — нарадзіўся (в. Малая Багацькаўка, цяпер у Мсціслаўскім раёне) Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі, беларускі геолаг, акадэмік АН Беларусі (1928), заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1930-м быў арыштаваны, асуджаны на 10 гадоў зняволення, пазбаўлены звання акадэміка. У 1934 годзе датэрмінова вызвалены, але зноў арыштоўваўся ў 1937 і 1938 гадах. Цалкам рэабілітаваны ў 1958-м, аднаўлены ў званні акадэміка. Аўтар прац па фальклоры, эканоміцы, геаграфіі, дэмаграфіі, сельскай і лясной гаспадарцы, археалогіі. Суаўтар руска-беларускага (1918) і маскоўска-беларускага (1921) слоўнікаў. Апублікаваў больш за 160 навуковых прац. Навуковыя даследаванні прысвечаны эканамічнай геаграфіі, геалогіі антрапагену і інжынернай геалогіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Памёр у 1988 годзе.



У свеце

**1600** год — нарадзіўся Гіём Балан, французскі картограф. У 1630—1648 гадах служыў у войску Рэчы Паспалітай у чыне капітана артылерыі. Стварыў карты тэрыторый Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны. У карце «Вялікае княства Літоўскае і Белая Русь» упершыню назва «Беларусь» вынесена ў загаловак.

**1847** год — нарадзіўся Джозеф Пулітцэр (1847—1911), амерыканскі выдавец, журналіст, газетны магнат, які лічыў, што «журналістыка з'яўляецца або па меншай меры павінна быць адной з выдатных інтэлектуальных прафесій». Завяшчаў сваё багацце на стварэнне школы журналістыкі пры Калумбійскім універсітэце (адкрыта ў 1912 годзе) і заснаванне прэмій за найлепшыя творы ў галіне літаратуры, мастацтва і музыкі.

**1927** год — нарадзіўся Віль Ліпатаў, рускі савецкі пісьменнік. Аўтар аповесцяў «Глухая Мята», «Сказанне пра дырэктара Пранчатава», «Вясковы дэтэктыў», раманаў «Ігар Сававіч», «І гэта ўсё пра яго...».

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 6.21 | 20.02 | 13.41 |
| Віцебск | — 6.08 | 19.54 | 13.46 |
| Магілёў | — 6.11 | 19.52 | 13.41 |
| Гомель | — 6.10 | 19.46 | 13.36 |
| Гродна | — 6.37 | 20.16 | 13.39 |
| Брэст | — 6.40 | 20.14 | 13.34 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 8 красавіка. Месяц у сузор'і Вадаліва.***

**Імяніны**

**Пр.** *Іларыёна, Сцяпана, Яўстрата.*
**К.** *Малгажаты, Міхаліны, Барыса, Генрыха, Макара, Міхала.*



Фота Надзеі БУЖАН.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

ВАРШАВА +19..+21°C
ВІЛЬНЮС +9..+11°C
КІЕЎ +19..+21°C
МАСКВА +7..+9°C
РЫГА +10..+12°C
С.-ПЕЦЯРБУРГ +6..+8°C

УСМІХНЕМСЯ

**Калі каму вельмі хочацца развесціся, перадаю каштоўную параду маёй бабулі: «Цярпіце і любіце адно аднаго. Дзве пенсіі лепш, чым адна!»**

— Мне ўчора жонка кажа: «Ідзі пагуляй з сабакам». Ну мы з Шарыкам і пагулялі... На 300 рублёў.

**Кацяня, якое правінілася, пасадзілі ў кут, дзе яно «правінілася» яшчэ раз.**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1428.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 9 красавіка 2018 года.